Ба 70353

ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР імя У. І. ЛЕНІНА

# АЖЫЦЦЁВІМ РАШЭННІ СТУДЗЕНЬСКАГА ПЛЕНУМА ЦК КПСС

РЭКАМЕНДАЦЫЙНЫ СПІС ЛІТАРАТУРЫ

*Вып. 1*

## ПАВЫШЭННЕ ЎРАДЖАЙНАСЦІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ КУЛЬТУР

МІНСК
1961

Ба 70353ф

ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР імя У. І. ЛЕНІНА

# АЖЫЦЦЁВІМ РАШЭННІ СТУДЗЕНЬСКАГА ПЛЕНУМА ЦК КПСС

РЭКАМЕНДАЦЫЙНЫ СПІС ЛІТАРАТУРЫ

*Вып. 1*

## ПАВЫШЭННЕ ЎРАДЖАЙНАСЦІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ КУЛЬТУР

Б 70353

1994 г.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

МІНСК
1961

Рэдакцыйна-выдавецкі аддзел Кніжнай палаты БССР
пры Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна

Складальнікі: *А. П. Дземчанкава і В. М. Сіленка*
Рэдактар *Н. В. Каляда*

## ДА ЧЫТАЧА

Студзеньскі Пленум ЦК КПСС прыняў велічную праграму ўздыму сельскай гаспадаркі. Для таго каб выканаць гэту праграму, трэба многа ведаць. Неабходна сачыць за навейшымі дасягненнямі сельскагаспадарчай навукі, вывучаць і ўкараняць ва ўсіх гаспадарках вопыт перадавікоў — гэтых «маякоў», як назваў іх М. С. Хрушчоў. Буйную гаспадарку можна весці толькі на навуковай аснове, таму брыгадзірам вытворчых брыгад, звеннявым, загадчыкам ферм, усяму калгаснаму актыву, асабліва моладзі, неабходна чытаць літаратуру па сваёй прафесіі.

У дапамогу брыгадзірам, звеннявым, загадчыкам жывёлагадоўчых ферм і ўсяму калгаснаму актыву Дзяржаўная бібліятэка БССР выдае гэтыя кароткія рэкамендацыйныя спісы. Усё выданне будзе складацца з двух выпускаў.

Вып. 1. Павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур.

Вып. 2. Больш прадуктаў жывёлагадоўлі краіне.

Кожны выпуск змяшчае кароткія рэкамендацыйныя спісы літаратуры па асобных пытаннях. У іх уключана масавая сельскагаспадарчая літаратура: кнігі ў асноўным за 1959 — 1961 гг., артыкулы — за 1960—1961 гг. У канцы амаль кожнага спісу прыведзены кнігі па той жа тэме, якія павінны выйсці з друку ў 1961 годзе.

Не абавязкова чытаць усю літаратуру, якая ўказана ў кожным спісу. Можна выбраць адну ці некалькі кніг па найбольш цікавячаму Вас пытанню. У падборы літаратуры Вам дапаможа анатацыя (кароткі пераказ зместу кнігі), якая змешчана пасля апісання. Калі Вам самім цяжка выбраць неабходную кнігу, звяртайцеся за дапамогай да бібліятэкара.

## РАШЭННІ СТУДЗЕНЬСКАГА ПЛЕНУМА ЦК КПСС — БАЯВАЯ ПРАГРАМА ДЗЕЯННЯЎ

«Студзеньскі Пленум ЦК КПСС 1961 года — важнейшая падзея ў жыцці партыі і савецкага народа».

З даклада К. Т. Мазурава на сходзе актыву Кампартыі Беларусі 31 студзеня 1961 г.

Пленум ЦК КПСС, які адбыўся ў студзені гэтага года, намеціў праграму барацьбы за новы магутны ўздым сельскай гаспадаркі, за стварэнне багацця сельскагаспадарчых прадуктаў.

У пастанове Пленума, дакладах і прамове таварыша М. С. Хрушчова былі адзначаны вялікія дасягненні ў развіцці сельскай гаспадаркі краіны і рэзка крытыкаваліся недахопы і памылкі ў кіраўніцтве сельскай гаспадаркай у некаторых рэспубліках і абласцях. У пастанове Пленума падкрэсліваецца, што «пытанні развіцця сельскай гаспадаркі павінны быць заўсёды ў цэнтры ўвагі нашай партыі. Без добра развітай сельскай гаспадаркі, без багацця сельскагаспадарчых прадуктаў не можа быць квітнеючай сацыялістычнай эканомікі»[1]. У пастанове вызначан рад буйных мер і мерапрыемстваў па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі. Пленум заклікаў партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі, усіх работнікаў сельскай гаспадаркі памножыць намаганні ў барацьбе за далейшы ўздым сельскай гаспадаркі, за дастойную сустрэчу XXII з'езда партыі.

**Пастановы** студзеньскага Пленума ЦК КПСС 1961 года. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1961. 28 стар. 7.000 экз. 3 к.

[1] Пастановы студзеньскага Пленума ЦК КПСС 1961 года. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1961, стар. 13.

**Хрушчоў М. С.** Павышэнне дабрабыту народа і задачы далейшага павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў. Прамова на Пленуме ЦК КПСС 17 студз. 1961 г. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1961. 96 стар. 9.000 экз. 12 к.

**Мазураў К. Т.** Аб выкананні дзяржаўнага плана і сацыялістычных абавязацельстваў па вытворчасці і продажу дзяржаве прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі ў 1960 годзе і аб мерапрыемствах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі. Даклад на Пленуме ЦК КПСС 11 студз. 1961 г. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1961. 24 стар. 5.000 экз. 3 к.

Даклады і выступленні іншых удзельнікаў Пленума ЦК КПСС друкаваліся ва ўсіх цэнтральных і мясцовых газетах з 10 па 24 студзеня 1961 г.

Пытанні, разгледжаныя на студзеньскім Пленуме ЦК КПСС, абмяркоўваліся на VI Пленуме ВЦСПС і IX Пленуме ЦК ВЛКСМ.

**Уперад,** за партыяй! Пастанова VI пленума ВЦСПС. — «Звязда», 1961, 28 студз.; «Калгас. праўда», 1961, 28 студз. пад загал. «Усе сілы на барацьбу за паспяховае ажыццяўленне рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС».

VI Пленум ВЦСПС поўнасцю адобрыў рашэнні студзеньскага Пленума ЦК КПСС і пастанавіў лічыць важнейшай задачай усіх прафсаюзных арганізацый мабілізацыю творчых намаганняў працоўных на барацьбу за далейшы ўздым сельскагаспадарчай вытворчасці. Пленум прапанаваў разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва за выкананне і перавыкананне ўсімі рэспублікамі, краямі і абласцямі, кожным сельскагаспадарчым прадпрыемствам заданняў 1961 года па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

**Аб удзеле** камсамольскіх арганізацый у выкананні пастановы студзеньскага (1961 года) Пленума ЦК КПСС «Аб выкананні дзяржаўнага плана і сацыялістычных абавязацельстваў па вытворчасці і продажу дзяржаве прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі ў 1960 годзе і аб мерапрыемствах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі». Пастанова IX пленума ЦК ВЛКСМ. — «Чырвоная змена», 1961, 14 лют.

У «Звяздзе» і «Калгаснай праўдзе» змешчан пераказ пастановы пад загал: «Усе сілы, энергію камсамольцаў, моладзі — на барацьбу за багацце прадуктаў».

Пленум ЦК ВЛКСМ падкрэсліў, што Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі мабілізуе ўсе сілы камсамольцаў і моладзі на барацьбу за паспяховае ажыццяўленне сямігадовага плана і рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС, за няспынны рост вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў.

ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пасля сту-

дзеньскага Пленума рад пастаноў, накіраваных на далейшы ўздым сельскай гаспадаркі.

**Аб рэарганізацыі** Міністэрства сельскай гаспадаркі СССР. Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР. — «Звязда», 1961, 21 лют.; «Калгас. праўда», 1961, 21 лют.

У пастанове гаворыцца аб тым, што ў сучасных умовах узнікла неабходнасць карэнным чынам перабудаваць апарат сельскагаспадарчых органаў, пераўтварыўшы яго з апарату адміністрацыйнага кіравання ў арганізатарскі цэнтр па ўкараненню ў вытворчасць дасягненняў навукі і перадавога вопыту. У пастанове адзначаны функцыі і прыведзена структура Міністэрства сельскай гаспадаркі СССР, міністэрстваў саюзных рэспублік, краявога або абласнога ўпраўлення сельскай гаспадаркі. Асветлены асноўныя напрамкі ў рабоце доследных гаспадарак.

**Аб утварэнні** Усесаюзнага аб'яднання Савета Міністраў СССР па продажу сельскагаспадарчай тэхнікі, запасных частак, мінеральных угнаенняў і іншых матэрыяльна-тэхнічных сродкаў, арганізацыі рамонту і выкарыстання машын у калгасах і саўгасах («Саюзсельгастэхніка»). [Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР]. — «Звязда», 1961, 22 лют.; «Калгас. праўда», 1961, 22 лют.

У пастанове адзначаны задачы аб'яднання «Саюзсельгастэхніка», яго структура. Новая сістэма забеспячэння калгасаў і саўгасаў матэрыяльна-тэхнічнымі сродкамі, пабудаваная на больш дэмакратычных асновах, дазволіць лепш улічваць запатрабаванні гаспадарак у тэхніцы, запасных частках і мінеральных угнаеннях у залежнасці ад занальных асаблівасцей розных раёнаў.

**Аб электрыфікацыі** сельскай гаспадаркі СССР у 1961—1965 гадах. [Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР]. — «Звязда», 1961, 23 лют.; «Калгас. праўда», 1961, 23 лют.

ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР даручылі ЦК кампартый і Саветам Міністраў саюзных рэспублік распрацаваць такія мерапрыемствы, каб не пазней 1965 года перавесці на электраэнергію ў калгасах і саўгасах абсталяванне для жывёлагадоўчых ферм, ачысткі і сушкі збожжа, першапачатковай перапрацоўкі сельскагаспадарчых прадуктаў, абсталяванне калгасных і саўгасных майстэрань і іншыя стацыянарныя машыны і абсталяванне.

**Аб перабудове** і паляпшэнні арганізацыі дзяржаўных закупак сельскагаспадарчых прадуктаў. — Аб паляпшэнні арганізацыі збыту лішкаў сельскагаспадарчых прадуктаў калгаснікаў і калгасаў. [Пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР]. — «Звязда», 1961, 28 лют.; «Калгас. праўда», 1961, 28 лют.

У мэтах паляпшэння нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў ЦК КПСС і Савет Міністраў пастанавілі, што з 1961 года закупкі збожжа, мяса, малака і іншых прадуктаў і сыравіны ажыццяўляюцца на аснове дагавораў кантрактацыі, якія з'яўляюцца заказам калгасам і саўгасам на неабходную дзяржаве прадукцыю. З мэтай забеспячэння больш арганізаванага збыту лішкаў сельскагаспадарчых прадуктаў калгасаў і калгаснікаў і вызвалення іх ад нерацыянальных затрат працы і сродкаў, звязаных з рэалізацыяй прадуктаў на калгасных рынках, ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прызналі неабходным, каб спажывецкая кааперацыя ўзмацніла закупку ў калгасаў і асабліва ў калгаснікаў лішкаў прадуктаў, якія дзяржава не купляе, і прадавала б іх на мясцовых рынках. Дзякуючы гэтаму калгаснікі не будуць адрывацца ад вытворчай работы ў калгасах.

У студзені — сакавіку гэтага года ў многіх эканамічных раёнах нашай краіны адбыліся нарады перадавікоў сельскай гаспадаркі, на якіх былі абмеркаваны вынікі студзеньскага Пленума ЦК КПСС і распрацаваны мерапрыемствы па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі гэтых раёнаў. На нарадах з прамовамі выступіў М. С. Хрушчоў. Гэтыя прамовы маюць вялікае значэнне не толькі для развіцця сельскай гаспадаркі дадзенага раёна, але змяшчаюць рад каштоўных парад і прапаноў для любых раёнаў нашай краіны.

**Хрушчоў М. С.** Паспяхова ажыццёвім рашэнні студзеньскага Пленума ЦК КПСС. Прамова тав. М. С. Хрушчова на Пленуме ЦК Кампартыі Украіны 28 студз. 1961 г. — «Звязда», 1961, 1 лют.; «Калгас. праўда», 1961, 1 лют.

У гэтай прамове таварыш М. С. Хрушчоў падрабязна растлумачвае, як павінны працаваць доследна-паказальныя гаспадаркі, якія перавагі мае новы парадак забеспячэння калгасаў і саўгасаў тэхнікай; гаворыць аб неабходнасці ўзмацнення матэрыяльнай зацікаўленасці калгаснікаў і рабочых саўгасаў, старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі ў павелічэнні вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў; аб укараненні вопыту перадавікоў ва ўсе гаспадаркі.

**Хрушчоў М. С.** Паўней выкарыстоўваць магчымасці Паўночнага Каўказа для павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў. Прамова тав. М. С. Хрушчова на нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі раёнаў Паўночнага Каўказа 1 лют. 1961 г. — «Звязда», 1961, 7 лют.; «Калгас. праўда», 1961, 7 лют.

Важнае значэнне маюць пастаўленыя таварышам М. С. Хрушчовым у гэтай прамове пытанні паляпшэння падрыхтоўкі кадраў спецыялістаў сельскай гаспадаркі, стварэння

вучнёўскіх брыгад у калгасах і саўгасах, правільнай арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Таварыш М. С. Хрушчоў уносіць прапанову ўвесці «Залатую кнігу», у якую заносіліся б імёны тых, хто датэрмінова дасягнуў узроўню вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў, прадугледжанага сямігадовым планам.

**Хрушчоў М. С.** Абапіраючыся на перадавы вопыт і дасягненні навукі, дабівацца агульнага ўздыму сельскай гаспадаркі. Прамова тав. М. С. Хрушчова на нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі абласцей Цэнтральнай чарназёмнай зоны Расійскай Федэрацыі ў г. Варонежы 11 лют. 1961 г. — «Звязда», 1961, 19 лют.; «Калгас. праўда», 1961, 19 лют.

У першую чаргу М. С. Хрушчоў указвае на неабходнасць павышэння дысцыпліны і адказнасці за гаспадарку, барацьбы з тымі, хто дапускае безгаспадарчасць. У прамове падкрэсліваецца вялікае значэнне шырокага распаўсюджвання вопыту перадавікоў сельскай гаспадаркі, умелага заахвочвання людзей да працы, размяшчэння сельскагаспадарчых навучальных устаноў у саўгасах; закранаюцца пытанні барацьбы з антыграмадскімі з'явамі. М. С. Хрушчоў спыняецца на пытаннях правільнай арганізацыі вытворчасці, стварэння кармавой базы жывёлагадоўлі, падрыхтоўкі кадраў для сельскай гаспадаркі. Ён адзначае таксама, што абавязак кожнага кіраўніка — чула прыслухоўвацца да голасу мас, хутчэй ліквідаваць недахопы.

**Хрушчоў М. С.** Павышаць узровень кіраўніцтва сельскай гаспадаркай. Прамова тав. М. С. Хрушчова на нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі нечарназёмнай зоны РСФСР у г. Маскве 23 лют. 1961 г. — «Звязда», 1961, 2 сак.; «Калгас. праўда», 1961, 2 сак.

Нечарназёмная зона РСФСР па сваіх умовах бліжэй за ўсё да ўмоў нашай рэспублікі. Таму ўсе пытанні, узнятыя таварышам Хрушчовым на гэтай нарадзе, датычацца і працаўнікоў сельскай гаспадаркі Беларусі. Таварыш М. С. Хрушчоў гаворыць аб тым, што галоўным напрамкам развіцця сельскай гаспадаркі нечарназёмнай зоны павінны быць малочная жывёлагадоўля і свінагадоўля, а таксама птушкагадоўля і развядзенне раманаўскіх авечак. Асноўнымі кармавымі культурамі павінны стаць кукуруза і цукровыя буракі. Таварыш М. С. Хрушчоў указаў таксама на няправільнае выкарыстанне пасяўных плошчаў у нечарназёмнай зоне. Неабходна павялічыць плошчы пад збожжавымі культурамі, ільном і каноплямі. Аднак атрымліваць высокія ўраджаі ўсіх гэтых культур у нечарназёмнай зоне можна толькі на добра ўгноенай глебе. Таварыш М. С. Хрушчоў раіць шырока выкарыстоўваць рэкамендацыі акадэміка Т. Д. Лысенкі па

ужыванню угнаенняў. Вялікае месца ў прамове займаюць пытанні падбору і выхавання кадраў.

**Хрушчоў М. С.** Сельская гаспадарка індустрыяльнага Урала павінна развівацца больш высокімі тэмпамі! Прамова тав. М. С. Хрушчова на нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі абласцей і аўтаномных рэспублік Урала ў г. Свярдлоўску 2 сак. 1961 г. — «Звязда», 1961, 7 сак.; «Калгас. праўда», 1961, 7 сак.

У прамове надаецца вялікае значэнне вопыту перадавікоў, павышэнню культуры земляробства з улікам занальных асаблівасцей, сістэме матэрыяльнага заахвочвання, арганізацыі працы ў калгасах, падбору кадраў і г. д. Адным з карэнных пытанняў з'яўляецца барацьба за прадукцыйнасць працы і зніжэнне сабекошту прадукцыі.

**Хрушчоў М. С.** Узяць новыя рубяжы ў развіцці сельскай гаспадаркі Сібіры. Прамова таварыша М. С. Хрушчова на нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі абласцей, краёў і аўтаномных рэспублік Сібіры ў г. Новасібірску 8 сак. 1961 г. — «Звязда», 1961, 12 сак.; «Калгас. праўда», 1961, 12 сак.

У прамове разгледжаны некаторыя канкрэтныя пытанні павелічэння вытворчасці збожжа і прадуктаў жывёлагадоўлі. Галоўную ўвагу М. С. Хрушчоў удзяляе пытанням развіцця жывёлагадоўлі, падкрэслівае значэнне вырошчвання на корм высокіх ураджаяў кукурузы і цукровых буракоў, кармавых бабоў для ўзбагачэння кармоў бялкамі, значэнне круглагадовага ўтрымання жывёлы на кукурузным сіласе. Спыняючыся на рабоце доследных станцый і інстытутаў, перадавых гаспадарак Сібіры, М. С. Хрушчоў паказвае ролю навукі ў далейшым уздыме гаспадаркі, гаворыць аб неабходнасці вывучаць і распаўсюджваць вопыт комплексных брыгад, павышаць адказнасць не толькі за ўраджай сваёй гаспадаркі, але і за ўраджаі калгасаў-суседзяў.

**Хрушчоў М. С.** Асваенне цаліны — вялікая перамога ленінскай палітыкі партыі. Прамова тав. М. С. Хрушчова на нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі Цаліннага краю 14 сак. 1961 г. — «Звязда», 1961, 19 сак.; «Калгас. праўда», 1961, 19 сак.

Шмат увагі ў прамове ўдзелена падрыхтоўцы спецыялістаў сельскай гаспадаркі, набліжэнню сельскагаспадарчых навучальных устаноў да вытворчасці, пытанням падбору, выхавання кадраў, кіраўніцтва сельскай гаспадаркай з боку партыйных арганізацый. Таварыш М. С. Хрушчоў гаворыць аб неабходнасці ўзмацнення клопатаў аб быце і культурным абслугоўванні працаўнікоў сельскай гаспадаркі.

Гаворачы аб задачах цаліннікаў па развіццю жывёлагадоўлі, таварыш М. С. Хрушчоў закранае агульныя пытанні

павышэння вытворчасці мяса на 100 гектараў ворнай зямлі і называе Беларусь сярод рэспублік, якія павінны мець мяса значна больш за сярэдні агульнасаюзны паказчык.

**Хрушчоў М. С.** Новы этап асваення цаліны і задачы сельскай гаспадаркі Казахстана. Прамова тав. М. С. Хрушчова на нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі Казахскай ССР у г. Алма-Аце 21 сак. 1961 г. — «Звязда», 1961, 26 сак.; «Калгас. праўда», 1961, 26 сак.

М. С. Хрушчоў у гэтай прамове гаворыць, што барацьба з шаблонам ва ўжыванні травапольнай сістэмы земляробства не азначае адмаўлення ад усялякага парадку ў земляробстве, а патрабуе распрацоўкі розных сістэм земляробства для ўсіх зон нашай краіны ў залежнасці ад канкрэтных прыродна-эканамічных умоў. Ён раіць вырошчваць больш гароху і кармавых бабоў, сеяць грэчку двухрадковым, а проса — шырокарадным спосабамі, сіласаваць кукурузу з саломай. У прамове зноў падкрэсліваецца значэнне матэрыяльнай зацікаўленасці калгаснікаў і рабочых саўгасаў, неабходнасць вылучэння здольных людзей на кіруючыя пасады.

На сходзе актыву Кампартыі Беларусі, які адбыўся 31 студзеня — 1 лютага 1961 г. у Мінску, былі ўсебакова і глыбока абмеркаваны рашэнні студзеньскага Пленума ЦК КПСС і падведзены вынікі развіцця сельскай гаспадаркі рэспублікі ў 1961 годзе. Сход вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы, ажыццяўленне якіх дазволіць датэрмінова дасягнуць устаноўленых для рэспублікі паказчыкаў.

**Па-баявому** ажыццёвім рашэнні студзеньскага Пленума ЦК КПСС. Рэзалюцыя сходу актыву Кампартыі Беларусі па дакладу першага сакратара ЦК КПБ тав. К. Т. Мазурава «Аб выніках студзеньскага Пленума ЦК КПСС 1961 года і мерах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі Беларускай ССР». — «Звязда», 1961, 3 лют.; «Калгас. праўда», 1961, 3 лют.

**Мазураў К. Т.** Аб выніках студзеньскага Пленума ЦК КПСС 1961 года і мерах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі Беларускай ССР. Даклад першага сакратара ЦК КПБ тав. К. Т. Мазурава на сходзе актыву Кампартыі Беларусі. — «Звязда», 1961, 2 лют.; «Калгас. праўда», 1961, 2 лют.

**Аб выніках** студзеньскага Пленума ЦК КПСС 1961 года і мерах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі Беларускай ССР. Спрэчкі па дакладу першага сакратара ЦК КПБ тав. К. Т. Мазурава. — «Звязда», 1961, 3 лют.; «Калгас. праўда», 1961, 3 лют. пад загал. «Са сходу актыву Кампартыі Беларусі».

11—12 красавіка праходзіў V Пленум ЦК КП Беларусі,

які абмеркаваў пытанні аб стане і мерах паляпшэння партыйна-арганізацыйнай работы ў партыйных арганізацыях КПБ і аб мерах па выкананню рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС. Па другому пытанню Пленум прыняў пастанову:

**Аб мерапрыемствах** па выкананню рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС аб павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў. Пастанова V Пленума ЦК КП Беларусі ад 12 крас. 1961 г. — «Звязда», 1961, 25 крас.; «Калгас. праўда», 1961, 25 крас.

Пленум заклікаў усе партыйныя і камсамольскія арганізацыі, савецкія і сельскагаспадарчыя органы, усіх працаўнікоў вёскі яшчэ шырэй разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва за ажыццяўленне рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС. Для гэтага неабходна прывесці ў дзеянне нявыкарыстаныя рэзервы і намаганні на далейшае арганізацыйнае ўмацаванне калгасаў і саўгасаў, настойліва змагацца за ўкараненне дасягненняў навукі і вопыту перадавікоў.

Даклады кіраўнікоў абласцей Беларускай ССР па гэтаму пытанню і спрэчкі па дакладах гл. у «Звяздзе» і «Калгас. праўдзе» ад 16 красавіка 1961 г.

## УЗДЫМ КУЛЬТУРЫ ЗЕМЛЯРОБСТВА — ГАЛОЎНАЕ У БАРАЦЬБЕ ЗА БАГАЦЦЕ ПРАДУКТАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

«Сельскагаспадарчая вытворчасць павінна быць арганізавана такім чынам, каб яна кожны год, пры любых умовах надвор'я, гарантавала атрыманне неабходных краіне прадуктаў для поўнага задавальнення патрэбнасці народа».

З пастановы Пленума ЦК КПСС 18 студз. 1961 г.

Дабіцца павелічэння ўраджайнасці немагчыма без павышэння агульнай культуры земляробства. Як гаворыцца ў дакладзе К. Т. Мазурава на Пленуме ЦК КПСС, перад сельскай гаспадаркай рэспублікі стаіць задача у 1961—1962 гг. поўнасцю асвоіць уведзеныя ў калгасах і саўгасах севазвароты; ужо ў 1961 годзе перайсці на суцэльную гатунковую сяўбу ўсіх культур, нарыхтаваць і ўнесці на палі 60 мільёнаў тон мясцовых арганічных угнаенняў, павялічыць ужыванне мінеральных угнаенняў. Неабходна дабіцца скарачэння тэрмінаў і павышэння якасці ўсіх сельскагаспадарчых работ.

Значнага прыросту сельскагаспадарчай прадукцыі можна дабіцца за кошт шырокага ўжывання хімічных мер барацьбы з пустазеллем, шкоднікамі і хваробамі сельскагаспадарчых раслін.

**Аб мерапрыемствах** па забеспячэнню ўнясення ў глебу угнаенняў пад ураджай сельскагаспадарчых культур 1961 года ў калгасах і саўгасах рэспублікі. [Пастанова ЦК КП Беларусі і Савета Міністраў БССР]. — «Звязда», 1961, 18 лют.; «Калгас. праўда», 1961, 18 лют.

**Рэкамендацыі** Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР [па падрыхтоўцы насеннага матэрыялу да веснавой сяўбы]).— «Калгас. праўда», 1961, 1 сак.

**Рэкамендацыі** Міністэрства сельскай гаспадаркі Беларускай ССР [па правядзенню вясенніх палявых работ]. — «Калгас. праўда», 1961, 9 сак.

**Даведнік** брыгадзіра паляводчай брыгады. Пад рэд. А. А. Русінава. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1958. 398 стар. 15.000 экз. 53 к.

У першай частцы даведніка змешчаны звесткі аб арганізацыі галіновых і комплексных брыгад, абавязках брыгадзіра, арганізацыі асноўных палявых работ у калгасе, парадку аплаты працы, аб арганізацыі планавання і ўліку ў брыгадзе, аб правілах скарыстання сельскагаспадарчай тэхнікі і коней. Частка другая прысвечана агратэхнічным асновам раслінаводства: агульнаму раслінаводству і агратэхніцы вырошчвання асобных культур, насенняводству, ахове раслін, арганізацыі кармавой базы. Прыведзен таксама прыкладны каляндар сельскагаспадарчых работ. У трэцяй частцы дадзены розныя даведачныя звесткі і вылічэнні, даведачны слоўнік.

**Сычоў Ф. І.** Вось што азначае агратэхнічны комплекс! — «Сельская гаспадарка Беларусі», 1961, № 2, стар. 11.

У артыкуле абагульняецца вопыт калгаса «Чырвоная Армія» Віцебскага раёна, які дзякуючы асваенню рашаючых звенняў агратэхнічнага комплексу (севазваротаў, сістэмы апрацоўкі і ўгнаення глебы, пасеву гатунковым насеннем) дасягнуў высокіх ураджаяў сельскагаспадарчых культур і добрых паказчыкаў у жывёлагадоўлі.

**Трашчанок М. А.** Кожнай гаспадарцы — рацыянальную сістэму земляробства. — «Сельская гаспадарка Беларусі», 1960, № 2, стар. 20—21.

Галоўны аграном саўгаса «Межава» Аршанскага раёна расказвае аб вопыце ўкаранення ў саўгасе травапольнай сістэмы земляробства на кіслых дзярнова-падзолістых сярэдніх суглінках.

**Казута І. Р.** і **Барысевіч І. М.** Што даюць правільныя травапольныя севазвароты. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1960. 80 стар. 6.000 экз. 11 к.

Аўтары разглядаюць агульныя пытанні распрацоўкі сістэм земляробства ва ўмовах БССР і асноўныя элементы травапольнай сістэмы земляробства: увядзенне травапольных севазваротаў, правільную апрацоўку глебы, сістэму прымянення ўгнаенняў. Ахарактарызаван стан увядзення і асваення правільных севазваротаў у калгасах і саўгасах рэспублікі. Прыведзены схемы палявых (з указаннем удзельнай вагі асобных культур) і кармавых севазваротаў, а таксама асаблівасці ўвядзення севазваротаў на тарфяна-балотных глебах. На прыкладзе перадавых калгасаў БССР паказана, што даюць правільныя севазвароты, як практычна прымяняюцца

сістэмы ўгнаенняў і апрацоўкі глебы ў залежнасці ад глеба-ва-кліматычных умоў і ўзроўню культуры земляробства.

**Бесман И. И.** и **Зенин С. М.** Опыт освоения севооборотов в колхозе имени Сталина (Дзержинский район Минской обл.). Минск, Госиздат БССР, 1960. 52 стр. с илл. 2.000 экз. 7 к.

Дана характеристика природно-экономических условий колхоза, описан опыт составления плана перехода к севообороту (приведены переходные таблицы). Большое внимание уделено размещению культур в полях севооборота и развитию травосеяния. Показана роль многолетних трав и посева люпина на зелёное удобрение в повышении урожайности сельскохозяйственных культур. Охарактеризованы системы обработки почвы и удобрения в севооборотах. Приводятся результаты хозяйственной деятельности колхоза имени Сталина, показывающие большое значение севооборотов в развитии всех отраслей хозяйства и увеличении выхода сельскохозяйственной продукции на 100 гектаров земли.

**Лысенко Т. Д.** Питание растений и удобрение полей. — «Правда», 1961, 25 февр.; «Калгас. праўда», 1961, 26 лют.

В речи академика Т. Д. Лысенко на совещании передовиков сельского хозяйства областей и автономных республик Центра России популярно изложена его теория биологического почвенного питания растений. Даны конкретные рекомендации по удобрению полей в нечерноземной зоне органо-минеральными смесями и приготовлению навозно-дерновых и навозно-земляных компостов.

**Вильдфлуш Р. Т., Брагин А. М.** и **Каликинский А. А.** Краткий справочник по удобрениям для БССР. 3-е испр. и доп. изд. Минск, Госиздат БССР, 1960. 298 стр. 11.000 экз. 41 к.

На основе обобщения результатов опытных работ с удобрениями в БССР и передовой практики колхозов и совхозов в справочнике даются рекомендации по производству, хранению и применению органических и рациональному использованию местных удобрений. Освещены вопросы применения системы удобрений в севообороте под полевые и овощные культуры, вопросы удобрения плодовых и ягодных культур, лугов и пастбищ. Рассматриваются особенности удобрения сельскохозяйственных культур на торфяно-болотных почвах низинного типа. В начале справочника сообщаются краткие сведения о питании растений и свойствах почв БССР в связи с применением удобрений.

**Балахонов С. И.** Как приготовлять, хранить и использовать органические удобрения. Минск, 1960. 32 стр. (О-во по распространению полит. и науч. знаний БССР. № 10). 9.060 экз. 5 к.

Брошюра обобщает достижения передовых хозяйств и

научных учреждений Белоруссии по приготовлению, хранению и высокоэффективному использованию навоза, торфа, птичьего помета, торфонавозных, торфонавозоминеральных, торфожижевых, торфолюпиновых и других компостов. Кратко освещены вопросы механизации приготовления и применения компостов.

**Лайков Н. З.** Опыт применения органо-минеральных смесей. Под науч. ред. А. И. Козловского. Минск, Изд-во Акад. с.-х. наук БССР, 1960. 40 стр. 5.000 экз. 5 к.

Излагаются теоретические основы применения органо-минеральных смесей в небольших дозах. Обобщены результаты собственных многолетних исследований автора о влиянии различных органо-минеральных смесей на урожай полевых культур. Показана эффективность их применения на различных почвах. Даны рекомендации по приготовлению, хранению и применению органо-минеральных смесей.

**Минкевич И.** Повышение плодородия легких почв. — «Колхоз. производство», 1960, № 7, стр. 19—20.

В БССР имеется около 10 миллионов гектаров легких почв, что составляет примерно половину земельной площади республики. Автор рекомендует в статье систему повышения плодородия легких почв, состоящую в правильном сочетании послойного внесения органических удобрений с зеленым удобрением и известкованием.

**Ралько В. А.** Фабрика удобрений. Минск, Госиздат БССР, 1960. 40 стр. (Новаторы с.-х. производства). 6.000 экз. 5 к.

Колхоз им. Сталина Пинского района, которым руководит Герой Социалистического Труда В. А. Ралько, благодаря правильному накоплению и использованию местных удобрений из года в год повышает урожаи сельскохозяйственных культур. Автор рассказывает об увеличении производства навоза и улучшении его качества путем круглогодового содержания скота на обильной подстилке с вывозкой навоза два раза в год, об организации хранения навоза и вывозке его на поля, о накоплении и использовании навозной жижи. Дополнительными ресурсами накопления органических удобрений является производство торфофекальных компостов в траншеях на пригородных полях колхоза. Охарактеризована система удобрений в севооборотах колхоза, показана эффективность известкования кислых почв.

**Ермилов Г. Б.** Полевая всхожесть семян и причины ее снижения. М., М-во сельского хозяйства РСФСР, 1960. 40 стр. с илл. (Вопросы повышения культуры земледелия). 24.000 экз. 7 к.

Повышение полевой всхожести семян — большой резерв увеличения урожайности сельскохозяйственных культур, со-

кращения затрат при посеве и снижения себестоимости продукции. Объясняя, что такое полевая всхожесть семян, автор рассказывает о хранении и предпосевной обработке семян, о влиянии на всхожесть влажности, состояния почвы, микроорганизмов и вредителей. Приведены примеры расчета хозяйственной годности семян и определения нормы высева в зависимости от качества посевного материала.

**Захараў С. С.** Занятыя папары і рацыянальнае іх выкарыстанне. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1960. 36 стар. 6.000 экз. 5 к.

Дадзена апісанне віка-аўсянага, жытне-вікавага, канюшынавага, бульбянога, кукурузнага, лубінавага (з пасевам лубіну на корм жывёле) і сідэральных папараў, а таксама сяўбы азімых па пласту і па абароту пласта шматгадовых траў пасля ільну. Прыведзены даныя па ўраджайнасці папаразанімаючых культур і азімых у перадавых гаспадарках і навукова-даследчых установах БССР, паказана высокая эфектыўнасць замены чыстых папараў занятымі. У спецыяльным раздзеле разгледжаны пытанні паглыблення ворнага слоя ў папаравых і прапашных палях, што з'яўляецца важным мерапрыемствам у справе павышэння ўраджайнасці азімых і папаразанімаючых культур.

**Памятка** о районированных сортах сельскохозяйственных культур в Белорусской ССР. Минск, Изд-во Акад. с.-х. наук БССР, 1960. 30 стр. 5.000 экз. 3 к.

Дана краткая хозяйственно-биологическая характеристика сортов полевых и овощных культур, районированных в БССР. Брошюра может служить руководством при апробации посевов для специалистов сельского хозяйства и бригадиров полеводческих бригад.

**Никифоров А. М.** Борьба с вредителями и болезнями сельскохозяйственных культур. 3-е изд. М., Сельхозгиз, 1960. 131 стр. с илл. (Учебники и учеб. пособия для подготовки с.-х. кадров массовой квалификации). 18.000 экз. 27 к.

Учебное пособие содержит сведения об основных возбудителях болезней и вредителях зерновых, бобовых, технических и овощных культур. Дана характеристика химических веществ, применяемых для этой цели. В одной из глав рассказывается об амбарных вредителях и мерах борьбы с ними. Указаны основные правила техники безопасности при хранении и использовании ядохимикатов.

**Безденко Т. Т.** Биологический метод борьбы с вредителями сельскохозяйственных культур. Минск, Изд-во Акад. с.-х. наук БССР, 1960. 43 стр. с илл.; 1 л. табл. 3.000 экз. 10 к.

На конкретных примерах показан вред, причиняемый сельскохозяйственным культурам насекомыми-вредителями, и эффективность борьбы с ними в колхозах и совхозах БССР

путем применения полезных насекомых (яйцеедов, наездников и хищников), бактерий и грибов, заражающих вредителей. Основное внимание автор уделяет использованию яйцееда-трихограммы в борьбе с вредителями плодовых, полевых и овощных культур.

**Агротехнические** требования по борьбе с наиболее распространенными и вредными сорняками на полях колхозов и совхозов Белоруссии. Минск, Госиздат БССР, 1960. 48 стр. с илл. (М-во сельского хозяйства БССР). 10.000 экз. Беспл.

Дана краткая характеристика малолетних и многолетних сорняков и сорняков-паразитов. Показан вред, причиняемый ими земледелию. Освещена система мер борьбы с сорняками в условиях Белоруссии. Основное место занимает описание химических методов борьбы с сорняками в посевах льна, зерновых культур и кукурузы. Показана эффективность применения гербицидов в колхозах Белоруссии.

**У 1961 годзе будуць выдадзены** наступныя кнігі па павышэнню культуры земляробства:

**Смирнов Н. Д. и др.** Краткий справочник по удобрениям. М., Сельхозгиз. (Срок выхода — 3-й квартал).

**Бычкоў А. І.** Больш угнаенняў — вышэй ураджай. Сельгасвыд БССР. (Тэрмін выхаду — 3-і квартал).

---

## ПАВЯЛІЧЫЦЬ ВЫТВОРЧАСЦЬ ЗБОЖЖА

«У развіцці ўсёй сельскагаспадарчай вытворчасці, у тым ліку і жывёлагадоўлі, рашаючую ролю адыгрывае далейшы ўздым зернявой гаспадаркі».

З прамовы М. С. Хрушчова на Пленуме ЦК КПСС 17 студз. 1961 г.

У дакладзе на Пленуме ЦК КПСС таварыш М. С. Хрушчоў рэзка крытыкаваў Беларусь за тое, што за апошнія гады ў рэспубліцы скараціліся пасяўныя плошчы пад збожжавымі культурамі, зменшыліся нарыхтоўкі збожжа. Для таго каб забяспечыць рост продажу збожжа дзяржаве, патрэбнасці калгаснікаў у харчовым збожжы і растучай грамадскай жывёлагадоўлі — у канцэнтраваных кармах, трэба давесці ў бліжэйшыя гады вытворчасць збожжа не менш чым да 4,5 мільёна тон. Неабходна значна павысіць ураджайнасць збожжавых культур.

Трэба расшырыць плошчу пасеваў асноўнай у Беларусі крупяной культуры — грэчкі і атрымаць ураджай яе не менш чым 5 цэнтнераў з гектара. У дакладзе на сходзе актыву Кампартыі Беларусі таварыш К. Т. Мазураў сказаў: «Справа гонару партыйных арганізацый усіх калгасаў і саўгасаў рэспублікі — зрабіць 1961 год пераломным у павелічэнні вытворчасці грэчкі».

**Аб мерах** па павелічэнню вытворчасці грэчкі ў калгасах і саўгасах рэспублікі ў 1961 г. [Пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР]. — «Звязда», 1961, 9 лют.; «Калгас. праўда», 1961, 9 лют.

**Савіцкі А. А.** Наш вопыт атрымання высокіх ураджаяў збожжавых культур. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1960. 28 стар. з іл. (Наватары с.-г. вытворчасці). 6.000 экз. 4 к.

Калгас «Зара камунізма» Навагрудскага раёна за апошнія шэсць год дабіўся значных поспехаў у павышэнні ўра-

джайнасці: у 1959 годзе сабрана збожжавых культур у сярэднім па 21 цэнтнеру з гектара, кукурузы — па 500 цэнтнераў. Высокія ўраджаі і іншых культур. Пры гэтым цэнтнер збожжа каштаваў калгасу 40 рублёў 60 капеек (у старых грошах). Старшыня калгаса на старонках гэтай брашуры расказвае аб тых мерапрыемствах, якія забяспечылі калгасу высокія ўраджаі як азімых, так і яравых культур.

**Дзенісенка Д. А.** Наш вопыт вырошчвання збожжавых і тэхнічных культур. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1960. 38 стар. з іл. і партр. 4.000 экз. 4 к.

Калгас імя Жданава Навагрудскага раёна штогод атрымлівае высокія ўраджаі збожжавых культур — па 17—22 цэнтнеры з гектара. Аўтар брашуры — старшыня калгаса — расказвае аб агратэхніцы збожжавых і тэхнічных культур у калгасе на суглінiстых і супясчаных глебах, аб уборцы гэтых культур. Спецыяльны раздзел прысвечан перадавікам калгаса — раслінаводам і механізатарам. Асветлены перспектывы развіцця калгаса на сямігодку.

**Яхімовіч А. С.** Павялічым вытворчасць збожжа. — «Сельская гаспадарка Беларусі», 1961, № 1, стар. 18.

Больш палавіны зямельнай плошчы калгаса «Радзіма» Драгічынскага раёна займалі балоты і забалочаныя землі. У артыкуле расказваецца аб асваенні калгасам тарфянікаў і вырошчванні на іх высокіх і ўстойлівых ураджаяў збожжавых культур.

Б/70353

**Кудласевіч І. А.** Ураджайнасць збожжавых узрасла ў тры разы. — «Сельская гаспадарка Беларусі», 1960, № 3, стар. 10.

Калгас імя Леніна Столінскага раёна ў 1959 годзе атрымаў па 20,8 цэнтнера збожжа з кожнага гектара. Старшыня гэтага калгаса коратка расказвае аб агратэхнічных мерапрыемствах па вырошчванню збожжавых культур — асваенні севазваротаў, угнаенні, сяўбе гатунковым насеннем, доглядзе пасеваў і г. д.

**Панглiш Р. П.** Насенняводства збожжавых культур у Беларускай ССР. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1959. 95 стар. з іл. 6.000 экз. 13 к.

Ахарактарызаваўшы значэнне, стан і задачы сартавога насенняводства ў БССР, аўтар асвятляе пытанні арганізацыі і метады насенняводчай работы па вытворчасці насення эліты, I і II рэпрадукцый. Асобны раздзел прысвечан арганізацыі насенняводчай работы ў калгасах і саўгасах. Апісана агратэхніка насенняводчых пасеваў і меры барацьбы са шкоднікамі і хваробамі. Прыведзена характарыстыка раянiраваных у БССР сартоў збожжавых і зернебабовых культур. Дадзены рэкамендацыі па правядзенню апрабацыі пасеваў і насеннага кантролю, састаўленню дакументацыі на сартавое

насенне. Расказана аб умовах нарыхтовак і водпуску сартавога насення.

**Міхалок П. М.** і **Хазанаў Н. Х.** Вопыт работы райнасенгаса «Сталінскі шлях» Мінскага раёна. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1960, 38 стар. з іл. 3.000 экз. 5 к.

Перадавы ў рэспубліцы райнасенгас «Сталінскі шлях» забяспечвае насеннем вышэйшых рэпрадукцый лепшых раяніраваных сартоў зерневых культур калгасы і саўгасы Мінскага і Дзяржынскага раёнаў. У брашуры дадзена агульная характарыстыка райнасенгаса і апісаны асаблівасці агратэхнікі насенняводчых пасеваў зерневых культур.

**Анохин А. Н.** Как получить высокие урожаи гречихи в БССР. Минск, Госиздат БССР, 1960. 68 стр. с илл. 4.000 экз. 9 к.

На основании обобщения опыта колхозов, совхозов и научно-исследовательских учреждений БССР и других районов нечерноземной полосы автор дает рекомендации по возделыванию гречихи в Белоруссии. Рассмотрены место этой культуры в севообороте, система обработки почвы и удобрения, способы подготовки семян к севу, мероприятия по уходу за посевами, уборка урожая. Показана хозяйственная ценность гречихи, описаны ее биологические особенности и требования к условиям произрастания. Охарактеризованы лучшие для БССР сорта гречихи, освещены вопросы ее семеноводства.

**Багрэеў Е. І.** Сейце больш грэчкі! — «Сельская гаспадарка Беларусі», 1960, № 4, стар. 14.

У артыкуле паказана гаспадарчае значэнне грэчкі і дадзены парады па яе вырошчванню ва ўмовах Беларусі.

**Аніскін В.** Адрадзіць славу церахоўскай грэчкі. — «Сельская гаспадарка Беларусі», 1961, № 2, стар. 13—14.

У артыкуле адзначаны прычыны скарачэння пасеваў і зніжэння ўраджайнасці грэчкі ў Церахоўскім раёне, які да вайны славіўся ўраджаямі гэтай культуры. Расказваецца аб барацьбе перадавікоў за зварот былой славы і аб поспехах паасобных калгасаў і брыгад у вырошчванні высокіх ураджаяў грэчкі.

**Пугач А. В.** Вырошчваць грэчку выгадна! — «Сельская гаспадарка Беларусі», 1960, № 5, стар. 11.

Калгас «Сталінец» Гарадзішчанскага раёна сее шмат грэчкі, бо пераканаўся ў яе вялікай выгадзе. За апошнія тры гады калгас атрымліваў ад рэалізацыі грэчкі больш 200 тысяч рублёў (у старых грошах) штогод. Сярэдні ўраджай за гэтыя гады склаў 9,2 цэнтнера з гектара. Старшыня калгаса А. В. Пугач у гэтым артыкуле коратка расказвае аб ужываемых агратэхнічных прыёмах вырошчвання грэчкі, даступных кожнай гаспадарцы.

**Багамолава М. Т.** і **Багамолаў А. М.** За высокі ўраджай ячменю ў БССР. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1959. 40 стар. з іл. 4.000 экз. 6 к.

У брашуры коратка разгледжаны асноўныя пытанні біялогіі, агратэхнікі і насенняводства піваварнага ячменю, распрацаваныя беларускімі навукова-даследчымі ўстановамі і перадавымі гаспадаркамі. Апісаны раяніраваныя ў БССР лепшыя сарты ячменю. Спецыяльны раздзел прысвечан барацьбе са шкоднікамі і хваробамі гэтай культуры.

**Горына Е. Д.** і **Анохін А. Н.** Вопыт атрымання высокіх ураджаяў проса ў БССР. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1956. 43 стар. з іл. 3.000 экз. 60 к.

Абагулен вопыт перадавых калгасаў рэспублікі, якія вырошчваюць высокія ўраджаі проса на дзярнова-падзолістых і тарфяна-балотных глебах. Прыведзены рэкамендацыі навукова-даследчых устаноў, прымяненне якіх ва ўмовах Беларусі дазволіць павысіць ураджайнасць проса. У пачатку брашуры апісаны батанічныя і біялагічныя асаблівасці гэтай культуры і яе сарты. Даюцца парады па раздзельнай і камбайнавай уборцы проса, ачыстцы і захоўванню насення.

**Тищенко А. Н.** Агротехника гороха в нечерноземной полосе. М., Сельхозгиз, 1958. 55 стр. с илл. 13.000 экз. 7 к.

В брошюре кратко обобщен опыт колхозов и научно-исследовательских учреждений по выращиванию высоких урожаев гороха в условиях нечерноземной полосы. Описаны основные биологические особенности гороха, его сорта и агротехника возделывания.

**Піндзіч І. М.** Раздзельная ўборка збожжавых культур. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1959. 95 стар. з іл. (Б-чка калгас. механізатара). 9.000 экз. 10 к.

На прыкладзе вопыту перадавых калгасаў БССР разгледжаны перавагі раздзельнага спосабу ўборкі і яго эфектыўнасць. Апісаны машыны для раздзельнай уборкі і пасляўборачнай апрацоўкі зерня, якія ўжываюцца ў Беларусі, іх канструкцыя, рэгуліроўка і тэхнічны догляд. Ахарактарызаваны агратэхнічныя патрабаванні да ўборкі збожжавых культур. Асветлена тэхналогія двухфазнай уборкі і асаблівасці ўборкі палеглага і вільготнага збожжа, уборкі яго на тарфяных глебах. Выкладзены пытанні кантролю якасці раздзельнай уборкі, правілы бяспекі і проціпажарныя мерапрыемствы.

**Шабуневич В. Д.** Опыт раздельной уборки зерновых культур в колхозах Уваровичского района. Минск, Изд-во Акад. с.-х. наук БССР, 1959. 35 стр. с илл. 4.000 экз. 4 к.

Показав преимущества раздельной уборки хлебов перед прямым комбайнированием, автор рассказывает об агротехнических требованиях к раздельной уборке, ее организации и

контроле за качеством. Большое внимание уделено способам скашивания и подборке хлебов при нормальных условиях, а также особенностям раздельной уборки малосоломистых низкорослых, полеглых, влажных, высокостебельных и высокоурожайных хлебов. Изложены правила техники безопасности при раздельной уборке.

**Бяспалаў М. М.** Механізаваны калгасны ток. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1959. 100 стар. з іл. (Б-чка калгас. механізатара). 10.000 экз. 9 к.

Дадзена апісанне зернеачышчальных машын, сушылак і сартыровак, рэкамендацыі па будове і абсталяванню механізаванага тока, камплектаванню агрэгатаў машын для пасляўборачнай апрацоўкі зерня. Апісан тэхналагічны працэс работы на таку. Асветлены пытанні арганізацыі працы, разліку забяспечанасці механізаванымі сродкамі, кантролю якасці работы машын. Дадзены парады па догляду машын, абсталявання і пляцовак тока, па тэхніцы бяспекі і процілажарных мерапрыемствах.

# КУКУРУЗА — КУЛЬТУРА ВЯЛІКІХ МАГЧЫМАСЦЕЙ

«Праз кукурузу ляжыць шлях павелічэння вытворчасці мяса і малака, а значыць, павышэння матэрыяльнага дабрабыту народа».

З прамовы М. С. Хрушчова на нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі абласцей і аўтаномных рэспублік Урала 2 сак. 1961 г.

Перадавыя калгасы нашай рэспублікі, ужываючы комплексную механізацыю, вырошчваюць высокія ўраджаі кукурузы. Так, у калгасе «Кастрычнік» Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці звяно механізатара Ул. Кота на плошчы 170 гектараў атрымала па 1.266 цэнтнераў зялёнай масы з пачаткамі з кожнага гектара. Трактарысты калгаса «Перамога» Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці Жудро і Харлап на плошчы 100 гектараў атрымалі па 1.165 цэнтнераў кукурузы з гектара.

Тав. К. Т. Мазураў у дакладзе на сходзе партактыву рэспублікі адзначыў, што ў паўднёвых раёнах Беларусі трэба сёлета пачаць вырошчваць кукурузу на зерне з выкарыстаннем яго для патрэб жывёлагадоўлі.

Неабходна, каб у 1961 годзе кукуруза вырошчвалася ў асноўным механізаваным спосабам, звеннямі, брыгадамі і атрадамі комплекснай механізацыі пры мінімальных затратах ручной працы.

**Цішкоў С.** Вырошчванне кукурузы ў БССР. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1959, 103 стар. з іл.; 1 л. іл. 14.000 экз. 15 к.

Выкладзены вынікі ўласных навуковых даследаванняў аўтара, матэрыялы навукова-даследчых устаноў, а таксама перадавы вопыт кукурузаводаў калгасаў і саўгасаў БССР. Апісаны біялагічныя асаблівасці кукурузы, яе групы і раяніраваныя ў БССР сарты і гібрыды. Асветлены асаблівасці

вырошчвання кукурузы ў розных глебава-кліматычных зонах Беларусі, меры барацьбы са шкоднікамі і хваробамі. Расказана аб уборцы і ўліку ўраджаю, сіласаванні кукурузы і кансерваванні пачаткаў, аб комплекснай механізацыі вырошчвання і ўборкі кукурузы.

**Гулейчык К. А.** Кукуруза на тарфяна-балотных глебах. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1960. 54 стар. 4.000 экз. 7 к.

Абагулен вопыт перадавых калгасаў, саўгасаў і навукова-даследчых устаноў Беларусі па вырошчванню кукурузы на асушаных і асвоеных тарфяніках. На аснове гэтага вопыту дадзены рэкамендацыі па выбару ўчастка і папярэдняй культуры ў севазвароце, па апрацоўцы глебы, унясенню ўгнаенняў, выбару сорта, тэрмінах і спосабах сяўбы, догляду пасеваў, барацьбе са шкоднікамі, уборцы кукурузы на сілас. Асветлен вопыт комплекснай механізацыі вырошчвання гэтай культуры. Паказана эканамічная эфектыўнасць вытворчасці кукурузы.

**Тишков С. И.** И у нас кукуруза вызревает. Минск, Госиздат БССР, 1961. 32 стр. 7.000 экз. 4 к.

Автор приводит многочисленные примеры получения высоких урожаев сухого зерна кукурузы (от 30 до 86 центнеров с гектара) в колхозах и совхозах различных районов нашей республики. В брошюре охарактеризованы кормовые достоинства сухого зерна кукурузы и початков восковой спелости, кратко описаны некоторые скороспелые и среднеспелые сорта и гибриды, могущие дать урожай спелого зерна в условиях Белорусской ССР. Даны рекомендации по агротехнике выращивания кукурузы на сухое зерно, борьбе с болезнями и вредителями, уборке, хранению и сушке зерна и семенного материала.

**Васильев В. А.** Как получить квадраты при механизированном севе кукурузы. Минск, Госиздат БССР, 1960. 52 стр. с илл. 10.000 экз. 7 к.

Обобщен опыт механизаторов-кукурузоводов Белоруссии и других республик. Даны рекомендации по технике сева, лучшему использованию и регулировке квадратно-гнездовых сеялок СКГК-6В и СКГН-6 (прицепной и навесной с диагональным переносом мерной проволоки), а также по переоборудованию сеялок с параллельным переносом проволоки для механического диагонального переноса. Изложены правила техники безопасности при работе на этих машинах.

**Кабрынец Т. А.** 1.725 цэнтнераў зялёнай масы кукурузы з кожнага гектара, Мінск, Дзяржвыд БССР, 1960. 24 стар. з іл. (Наватары с.-г. вытворчасці). 6.000 экз. 4 к.

Кукурузаводы калгаса «Перамога» Пружанскага раёна вырасцілі ў 1959 годзе ў сярэднім па 914 цэнтнераў зялёнай

масы кукурузы з гектара. А звяно аўтара брашуры Т. А. Кабрынец дабілася рэкорднага для БССР ураджаю — 1.725 цэнтнераў з кожнага з 30 замацаваных за ім гектараў. Пры гэтым цэнтнер зялёнай масы і пачаткаў з участка звяна абышоўся калгасу ўсяго ў 45 капеек (у старых грошах). Звеннявая расказвае ў брашуры, як удалося вырасціць такі высокі ўраджай у неспрыяльны для кукурузы засушлівы год.

**Кулеш И. В.** Наш опыт комплексной механизации возделывания кукурузы и льна. Минск, 1960. 23 стр. с илл. (О-во по распространению полит. и науч. знаний БССР, № 5). 9.760 экз. 4 к.

Герой Социалистического Труда, механизатор колхоза «Чырвоны сцяг» Речицкого района Гомельской области И. В. Кулеш вместе со своим напарником В. Шурпо, применив комплексную механизацию выращивания кукурузы по методу Гиталова и Мануковского, собрал в 1959 году по 800 центнеров зеленой массы кукурузы с каждого из 190 гектаров. Одновременно они принимали участие в тереблении 210 гектаров льна. Знатный механизатор рассказывает в брошюре о своем опыте, дает советы, как лучше организовать комплексную механизацию возделывания этих культур.

**Кот В. П.** Путь к успеху. Минск, Госиздат БССР, 1960. 20 стр. с илл. (Выставка достижений нар. хозяйства СССР). 8.000 экз. Беспл.

В. П. Кот, звеньевой механизированного звена колхоза «Октябрь» Хойникского района Гомельской области, освещает опыт комплексной механизации возделывания кукурузы квадратно-гнездовым способом. Его звено в 1960 году с площади 170 гектаров получило 1.266 центнеров зеленой массы с початками с каждого гектара. В. П. Кот делится опытом использования сеялки СКГК-6В, самоходного комбайна СК-3 и другой техники на кукурузных полях, описывает агроприемы возделывания кукурузы, рассказывает о комбайновой уборке этой культуры и закладке силоса.

**У 1961 годзе будуць выдадзены** наступныя кнігі па вырошчванню кукурузы:

**Справочник** по кукурузе. М., Сельхозгиз. (Срок выхода — 3-й квартал).

**Жудро Г. Ф.** Как мы выращиваем кукурузу. Сельхозгиз БССР. (Срок выхода — 4-й квартал).

## УМАЦОЎВАЦЬ КАРМАВУЮ БАЗУ ДЛЯ ГРАМАДСКАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

«Умацаванне кармавой базы жывёлагадоўлі ажыццяўляць у першую чаргу за кошт далейшага павелічэння вытворчасці кукурузы.

Прыняць меры да далейшага расшырэння пасеваў кармавых лубінаў, вікі, гароху, шматгадовых траў, да закладкі шматгадовай культурнай пашы, да ачысткі ад кустоў і павышэння прадуктыўнасці натуральных выпасаў і сенажацей».

З рэзалюцыі сходу актыву Кампартыі Беларусі 1 лют. 1961 г.

Рашаючай умовай далейшага ўздыму жывёлагадоўлі з'яўляецца ўмацаванне кармавой базы, у першую чаргу за кошт расшырэння вытворчасці кукурузы. Каштоўнай кармавой культурай з'яўляюцца цукровыя буракі[1]. У мэтах забеспячэння жывёлы бялковымі кармамі неабходна павялічыць плошчы пад пасевамі кармавога лубіну, вікі, сарадэлі і шматгадовых траў. Больш увагі трэба ўдзяляць павышэнню прадуктыўнасці натуральных кармавых угоддзяў і закласці ў 1961 годзе шматгадовую культурную пашу на плошчы 160 тысяч гектараў.

**Забела Д. А.** і **Розенблюм Б. М.** Зялёны канвеер. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1959. 90 стар. 7.000 экз. 11 к.

Дадзены практычныя рэкамендацыі па арганізацыі зялёнага канвеера ў калгасах і саўгасах БССР з улікам іх гаспадарча-эканамічных і прыродных асаблівасцей. Разгледжаны задачы зялёнага канвеера і падбор культур для яго. Прыве-

